

ВІТАЛІЙ ГІЛЬ

# УНІКАЛЬНАЯ ІНВЕСТЫЦЫЯ Ў БУДУЧЫНЮ

## Урачыстае адкрыццё новай Нацыянальнай бібліятэкі стала падзеяй для краіны

Тонкія промні накіраванага святла разбіваюцца аб мастацкі вытанчаныя талеркі рэфлектараў і мякка, не перашкаджаючы воку, разліваюцца па прасторных залах. Вы праходзіце па празрыстым поле да аўтаматызаванага працоўнага месца. Набор заказу на камп'ютэры пры веданні праграмы займае не больш за хвіліну. Зрэшты, яна дастаткова простая і нават непадрыхтаваны карыстальнік можа хутка яе засвоіць. Націск клавішы "enter", і заказ адпраўлены ў электронны мозг, які літаральна праз долю секунды аддае каманду аўтамату-выканаўцы. У гэты ж час недзе над галавой, на дзесятак паверхаў вышэй, ажывае хітры механізм. Ён адшукае патрэбную адзінку і накіруе яе адрасату тээліфтам. Ледзь чутнае зумканне каляскі недзе пад столяй сведчыць пра тое, што заказ выкананы. Вы аказваецеся ў цішы зала на персанальным працоўным месцы, адкрываеце кнігу і заглыбляецеся ў свет ведаў...

Яшчэ зусім нядаўна гэтыя радкі больш бы падыходзілі навукова-фан-



БЕЛТА



БЕЛТА



ВІТАЛІЙ ГІЛЬ

тастычнай аповесці, чым рэпартажу з месца падзей. Ды і распрацоўшчыкі архітэктурнага праекта новага будынка Нацыяльнай бібліятэкі ў свой час наўрад ці маглі нават у думках наблізіцца да ўяўлення пра тое, якімі будуць "начынне" і функцыянальнасць пабудовы. Ужо пасля цырымоніі адкрыцця, у бяседзе з журналістамі, Аляксандр Лукашэнка прызнаўся: праект карэкціраваўся ці не кожны дзень. "Калі б мы пабудавалі яго па старых стандартах, як гэта некалі задумвалася, вы б нас раскрытыкавалі", — зазначыў ён. Таму ўсе навінкі, усе самыя новыя рашэнні, якія нехта недзе падгледзеў, адразу ж прымяняліся на новабудоўлі.

Падыходзілі — укаранялі. Прычым сіламі сваіх, беларускіх спецыялістаў. "Гэта сапраўдная школа для нашай краіны", — перакананы Прэзідэнт.

Пачалі будаваць бібліятэку, а ўзвялі самы буйны інфармацыйны сацыякультурны цэнтр. Гэта сапраўды скарбонка ведаў, магчымасці якой далёка не абмяжоўваюцца зместам бібліятэчных фондаў. Сучаснымі камунікацыямі мінская бібліятэка звязана з установамі-партнёрамі па ўсім свеце. Яна стала часткай інтэлектуальнай скарбніцы планеты.

Унікальны комплекс — удалы штрых да найноўшай гісторыі краіны ў асветніцкім XXI стагоддзі — эпосе ведаў, тэхналогій і інтэлекту. Пройдзе час, і Мінск, іншыя беларускія гарады ўпрыгожаць не менш цудоўныя і функцыянальныя будынкі. Хутка распачнецца будаўніцтва культурна-спартыўнага парку "Мінск-Арэна". Ёсць яшчэ шэраг цікавых задум. Але бібліятэка заўсёды будзе займаць у архітэктуры, у гісторыі горада асаблівае месца. Сэнсавае напаўненне гэтага праекта вельмі вялікае. Ну а вопыт, набыты будаўнікамі, робіцца яшчэ больш каштоўным у развіцці... Ужо сёння беларускіх спецыялістаў запрашаюць для працы ў іншых дзяржавах. Словам, майстэрства патрэбна паўсюль. Хаця ад некаторых прапаноў даводзіцца і адмаўляцца. Аляксандр Лукашэнка зазначыў, што мы падышлі да рубяжу, калі і для ўласных патрэб сваіх будаўнікоў не хапае. Краіна будуецца вельмі актыўна. Асабліва ў рэгіёнах. А мясцовыя будаўнічыя магутнасці вельмі скараціліся падчас постсавецкага крызісу. Але іх аднаўленне дазволіць праблему вырашыць. І такая задача пастаўлена.

**УНІКАЛЬНЫ КОМПЛЕКС — УДАЛЫ ШТРЫХ ДА НАЙНОЎШАЙ ГІСТОРЫІ КРАІНЫ Ў АСВЕТНІЦКІМ XXI СТАГОДДЗІ — ЭПОСЕ ВЕДАЎ, ТЭХНАЛОГІЙ І ІНТЭЛЕКТУ. БІБЛІЯТЭКА ЗАЎСЁДЫ БУДЗЕ ЗАЙМАЦЬ У АРХІТЭКТУРЫ, У ГІСТОРЫІ ГОРАДА АСАБЛІВАЕ МЕСЦА. СЭНСАВАЕ НАПАЎНЕННЕ ГЭТАГА ПРАЕКТА ВЕЛЬМІ ВЯЛІКАЕ**